ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *РЭЦЭНЗІІ*
### *REVIEWS*

Паступіў у рэдакцыю 09.09.2021
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2021-66-4-508-512 Received 09.09.2021

**І. А. Саракавік**

*Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Мінск, Беларусь*

# СПАТКАННЕ З МАЛАДОСЦЮ

Жаданне напісаць гэтую рэцэнзію выклікана дзвюма абставінамі. Па-першае, усё маё свядомае жыццё так ці інакш звязана з юнацтвам. Спачатку ў якасці аднаго з актывістаў моладзевага руху – сакратара камсамольскай арганізацыі адной з буйнейшых на той час у Нясвіжскім раёне Гарадзейскай сярэдняй школы; затым старшыні студэнцкага навуковага таварыства Мінскага педінстытута імя А. М. Горкага, намесніка сакратара камсамольскай арганізацыі гэтай установы; потым з працай у ЦК ЛКСМБ (інструктарам, загадчыкам сектара, аддзела, сакратаром ЦК ЛКСМБ). Затым маё жыццё (звыш 40 гадоў) было звязана з выкладчыцкай дзейнасцю ў вышэйшай школе, а значыць, з маладымі людзьмі. У навуковым плане адзін з кірункаў даследавання – гэта дзейнасць ЛКСМБ, што дае падставы цікавіцца, сачыць за навуковымі працамі, якія асвятляюць такі ўзрост чалавека, як юнацтва.

Па-другое, і самае галоўнае, – гэта праца В. В. Даніловіча “Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве савецкай Беларусі” (Мінск: Беларуская навука, 2020. – 730 с.). Улічваючы аб’ём манаграфіі, напісаць усебаковую рэцэнзію на кнігу не ўяўляецца магчымым. Дзеля гэтага спатрэбіўся б не адзін дзясятак старонак. Таму спынемся толькі на некаторых аспектах працы.

Кастрычніцкая рэвалюцыя прывяла да карэннага злому ранейшага буржуазнага дзяржаўнага механізма і замахнулася на не меншае пераўтварэнне свядомасці грамадства па свайму разуменню. У гэты працэс уцягвалася моладзь, на якую была зроблена галоўная стаўка. Прадстаўнікі моладзі заўсёды поўныя энергіі, пазбаўленыя жыццёвага вопыту, часам маюць бунтарскі характар, лёгка паддаюцца ўзрушэнням, адначасова з’яўляючыся стваральнай сілай і будучыняй грамадства.

Калі злом буржуазнага механізма дзяржавы адбываўся хоць і з цяжкасцямі, але пераканаўча, то ажыццявіць змену свядомасці людзей было ў разы складаней. Не ўсе ў грамадстве падзялялі ідэі і практыку дзеянняў новай улады. Моладзь адгукалася хутчэй. Ідэі пераўтварэнняў яе захапілі намнога больш, чым іншыя ўзроставыя і сацыяльныя слаі грамадства. Пабудова новай дзяржавы і грамадства асабліва складанай стала ў міжваенны час, у 1920–1930-я гг. Аднак складанасць перыяду не з’явілася перашкодай для даследчыка В. В. Даніловіча, які прысвяціў яму сваю адзначаную вышэй манаграфію.

Ужо сама назва сведчыць, а змест працы пацвярджае, што аўтар правамерна надаў асноўную ўвагу даследаванню арганізацыі і дзейнасці маладзёжных арганізацый па ўсталяванню савецкай грамадска-палітычнай сістэмы, удзелу моладзі ў духоўна-культурных пераўтварэннях грамадства, яе дзейнасці па мадэрнізацыі эканомікі і ў разгортванні фізкультурна-спартыўнай і ваенна-патрыятычнай работы. Другімі словамі, у манаграфіі разглядаецца ўдзел маладых людзей

© Саракавік І. А., 2021

ва ўсіх сферах жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы на савецкай аснове ў так званы пераходны перыяд ад капіталізму да сацыялізму. Такім чынам, змест манаграфіі адпавядае заяўленай тэме.

В. В. Даніловіч даволі поўна аналізуе гістарыяграфію тэмы, звяртаючы ўвагу не толькі на працы пасляваеннага перыяду, але, што каштоўна, і на працы аўтараў 1920–1930-х гг., паколькі яны перадавалі подых часу і да перабудовы практычна былі не дасягальныя для даследчыкаў. Станоўчым з'яўляецца і тое, што ў манаграфіі аналізуюцца працы вучоных, у тым ліку кандыдацкія дысертацыі, постсавецкага перыяду. Толькі пажадана было б адзначыць, ці маюцца ў апошніх працах новыя падыходы да тэмы ў параўнанні з дасавецкім перыядам гісторыі, бо на даследчыкаў аб'ектыўна ўплывае іх мінулае, і не ўсе з іх могуць, а некаторыя і не жадаюць улічваць змены часу, грамадскіх адносін і па-новаму, з улікам найноўшых дасягненняў гістарычнай навукі, прааналізаваць ранейшыя падзеі.

У манаграфіі дастаткова поўна раскрываецца багатая крыніцазнаўчая база даследавання як разглядаемага перыяду, так і пасляваеннага часу, а таксама сучасная. Асабліва каштоўныя матэрыялы, практычна ўпершыню ўведзеныя аўтарам у навуковы ўжытак, пададзены з Нацыянальнага архіва і Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі, дзяржаўных архіваў абласцей. В. В. Даніловіч таксама ўвёў у навуковы ўжытак новыя дакументы з архіваў Расійскай Федэрацыі, што з'яўляецца найбольш карысным. Ужо нават гэты няпоўны пералік крыніц сведчыць, без перабольшання, аб велізарным аб'ёме працы, праведзенай аўтарам на працягу многіх гадоў па зборы, сістэматызацыі, дыферэнцыяцыі, абагульненні, даследаванні матэрыялаў, якія больш аб'ектыўна паказалі ўдзел моладзі ў пераўтварэннях 1920–1930-х гг. з пазіцый сучаснай гістарычнай навукі.

Значную ўвагу аўтар звяртае (прыкладна 217 старонак кнігі), і не без падстаў, на пытанні станаўлення маладзёжных арганізацый і іх дзейнасць па ўсталяванні савецкай грамадска-палітычнай сістэмы. Асабліва заслугоўвае ўвагі параграф аб станаўленні і развіцці маладзёжных арганізацый. У савецкай практыцы даследаванняў асаблівая ўвага надавалася выключна ўтварэнню і дзейнасці камсамола Беларусі. Аднак такі падыход быў спрошчаны, а ў навуковай практыцы – не апраўданы. Справа ў тым, што арганізацыйнае станаўленне і развіццё камсамола, па-першае, не адбывалася адналінейна, на яго шляху былі як пазітыўныя, так і крызісныя тэндэнцыі, аб якіх не згадвалася даследчыкамі раней, па-другое, моладзь (як раней, так і цяпер) не з'яўляецца аднолькавай у сваіх палітыка-ідэалагічных, духоўных поглядах, часам яна нават не можа іх вызначыць сама. На прадстаўнікоў моладзі больш уплываюць маральна-псіхалагічныя, бунтарскія ўздзеянні, чым разумовыя, юнакі і дзяўчаты асабліва не аналізуюць прычыны і наступствы такіх уздзеянняў. Для іх характэрны нестандартныя, нефармальныя паводзіны, якія, часам, не адпавядаюць агульнапрынятым паводзінам у грамадстве. Моладзь востра адчувае несправядлівасць, фальш, настаўленні і выступае супраць іх, глыбока не аналізуючы стан спраў. У той жа час юнакі і дзяўчаты лепш успрымаюць і разумеюць найноўшыя дасягненні навукі і тэхнікі, самі імкнуцца праявіць сябе ў гэтых галінах і часам дасягаюць нечаканых станоўчых вынікаў, чаму можна толькі пазайздросціць. Моладзь, што важна для дзяржавы, валодае энергіяй, аптымізмам, марыць дабіцца лепшага ў жыцці для сябе і грамадства, яна – рухавік грамадства, перадатачнае звяно пакаленняў: ад сваіх бацькоў і да сваіх дзяцей. Таму не выпадкова, што нават у ЛКСМБ, як паказвае аўтар, існавалі розныя падыходы да арганізацыі і дзейнасці камсамола.

У той жа час для маладых людзей характэрны і пэўныя асаблівасці, звязаныя з узростам, станаўленнем светапогляду, маральных каштоўнасцей, пэўным сацыяльным слоем (рабочых, сялян, інжынерна-тэхнічных работнікаў, інтэлігенцыі, кіраўніцкіх работнікаў рознага ўзроўню – ад раённага да рэспубліканскага і інш.), а ў 1920-х гг. – яшчэ і з так званымі нэпманамі. Не меншае значэнне мелі пэўныя віды дзейнасці: вучоба ў агульнаадукацыйнай, прафесійна-тэхнічнай, вышэйшай школе, праца на заводах і фабрыках, у сельскай гаспадарцы і г. д. Безумоўна, у цэлым адносіны моладзі да пэўнага сацыяльнага слоя, род дзейнасці істотна ўплывалі і ўплываюць на яе светапогляд, канкрэтныя дзеянні, жаданне аб'ядноўвацца з падобнымі сабе, праявіць сябе, дасягнуць пэўных мэт, іншы раз не заўсёды пазітыўных.

В. В. Даніловіч на аснове дакументальных матэрыялаў выразна выдзяляе пяць асноўных сацыяльных катэгорый моладзі – рабочая, сялянская, саматужніцкая, гандлярская, служачая, хаця

афіцыйна было вызначана восем – рабочая, сялянская, кулацкая, батрацкая, беспрытульная, беспрацоўная, нацыяналістычная, рэлігійная (с. 23). Чамусьці аўтар, а таксама афіцыйныя крыніцы таго часу не звярнулі ўвагу на такую сацыяльную катэгорыю моладзі, як навучэнская, у якую, асабліва напрыканцы 1920-х – 1930-х гг., уваходзіла значная частка моладзі. У той жа час В. В. Даніловіч правамерна заключае, што "такая стракатасць сацыяльнага складу маладога пакалення ўплывала на стварэнне маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў" (с. 23). Адзначым, што на іх стварэнне не менш уплывалі палітычныя партыі, якім неабходны быў баявы рэзерв і надзейны памочнік у сваіх справах. Аднак пасля так званага леваэсэраўскага мяцяжу 1918 г. усе нават левыя сацыялістычныя партыі ў савецкай Расіі былі забаронены, у Беларусі з прычыны знешне- і ўнутрыпалітычнага становішча – значна пазней.

Упершыню ў гістарычнай навуцы Беларусі аўтар на аснове архіўных матэрыялаў дасканала, пераканаўча паказвае стварэнне і дзейнасць шматлікіх маладзёжных грамадскіх суполак, аб'яднанняў, арганізацый, гурткоў, саюзаў, якія не ўваходзілі ў склад камсамола. Гэта быў сапраўдны зрэз грамадскага становішча маладых людзей. Па яго падліках, у пачатку 1920-х гг. у ССРБ існавала каля 120 такіх грамадскіх аб'яднанняў (с. 24). Не ўсе яны былі прасавецкімі, паколькі адлюстроўвалі погляды розных сацыяльных слаёў грамадства, якое выйшла з капіталізму. Але праўда і тое, што ўсе гэтыя суполкі з'яўляліся ў сваёй большасці малалікімі, не мелі рэспубліканскага маштабу і значнасці. Іх стракатасць у многім тлумачылася маладосцю самой савецкай улады, якая не мела практычнага вопыту дзейнасці, ды і ў першы час улада імкнулася ўмацаваць сваё становішча ў краіне, бо ўзяць уладу і ўтрымаць яе – гэта не адно і тое ж. Улада тым не менш дала магчымасць юнакам і дзяўчатам праявіць сябе ў розных сферах, выявіць іх схільнасці і патрэбы дзеля таго, каб можна было ўплываць на моладзь у патрэбным рэчышчы – сацыялістычным, савецкім.

На аснове значнага дакументальнага матэрыялу, найперш з архіўных крыніц, аўтар аналізуе ўтварэнне і дзейнасць такіх маладзёжных арганізацый у розных рэгіёнах Беларусі, у тым ліку, што важна для навукі, якія былі этнічна беларускімі, але з другой паловы студзеня 1919 г. знаходзіліся па рашэнню кіраўніцтва РСФСР у складзе гэтай краіны, а затым у 1924 і 1926 гг. былі вернуты БССР. В. В. Даніловіч адзначае, што з умацаваннем савецкай улады, утварэннем Саюза ССР кіраўніцтва дзяржавы і рэспублікі ўсё больш стала звяртаць увагу на дзейнасць шматлікіх нефармальных гурткоў, клубаў, арганізацый, узмацніла кантроль за іх дзейнасцю. Дзеля гэтага кіраўнікоў маладзёжных арганізацый абавязалі прадаставіць статуты, спісы членаў праўленняў і актыву ў Наркамат асветы ССРБ. Тыя ж з іх, якія не выконвалі дзяржаўных установак, закрывалі. Больш за тое, іх актывістаў звальнялі з працы, выключалі з навучальных устаноў (с. 77).

Змястоўныя старонкі працы прысвечаны знакавай радыкальнай арганізацыі на чале з настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Ю. Лістападам на Случчыне. Справа набыла такое грамадскае гучанне, што нават было прынята рашэнне Палітбюро ЦК ВКП(б) 28 студзеня 1926 г. аб правядзенні адкрытага паказальнага судовага працэсу над яе членамі (с. 78). Шэраг лістоў прысвечаны дзейнасці арганізацый яўрэйскай моладзі (с. 82–97). І гэта не выпадкова, паколькі доля яўрэйскага насельніцтва ў некаторых гарадах і асабліва мястэчках была вельмі значнай. На канец XIX ст. на мове іудзеяў размаўляла 14 % усяго насельніцтва Беларусі, а згодна з перапісам 1926 г. – 8,2 %. З прычыны розных фактараў яна была больш арганізаванай, мэтанакіраванай і адукаванай, чым прадстаўнікі іншых этнасаў. Не выпадкова на канец 1922 г. у складзе ЦК КСМБ налічвалася 83 % яўрэяў, а беларусаў увогуле не было (с. 30). Як і сярод прадстаўнікоў беларускіх маладзёжных арганізацый, сярод яўрэйскіх юнакоў і дзяўчат назіралася стракатаць у іх палітыка-ідэалагічных і духоўных поглядах. Меліся арганізацыі камуністычнага і сіяністкага кірунку, якія ўсебакова аналізуюцца аўтарам у асноўным дзякуючы архіўным звесткам.

Не абмінуў В. В. Даніловіч і беларускія нацыянальныя маладзёжныя гурткі, але ім, як адзначае аўтар, не ўдалося стварыць уласны каардынацыйны цэнтр, што сведчыць аб слабасці беларускага нацыянальнага руху ў асяродку маладых людзей. Са свайго боку, як правамерна адзначае В. В. Даніловіч, улады праследавалі беларускія нацыянальна-дэмакратычныя маладзёжныя арганізацыі (с. 82). Можна дапоўніць, што многія такія гурткі ўтвараліся найперш у гарадах, радзей

у мястэчках, у той жа час падаўляючая частка беларусаў пражывала ў вёсцы, таму гэта таксама ўплывала на іх малалікасць. А калі дадаць да гэтага невысокі адукацыйны ўзровень маладых людзей сельскай мясцовасці, то ўсё стане зразумелым.

Аўтар не абмяжоўваецца даследаваннем маладзёжных арганізацый на тэрыторыі Беларусі і прасочвае дзейнасць беларускіх суполак на тэрыторыі ў асноўным РСФСР, дзе навучаліся тысячы беларускіх юнакоў і дзяўчат (с. 79–82). Аўтару манаграфіі трэба было патлумачыць, што ў Расіі пражывалі, асабліва з-за беззямелля на Радзіме да рэвалюцыі, сотні тысяч беларусаў са сваімі сем'ямі, якія збераглі этнічны беларускі ўклад. Многія там і засталіся. Іх дзеці, а не толькі студэнты, таксама папаўнялі беларускія нацыянальныя суполкі. У той жа час у Заходняй Беларусі ствараліся і дзейнічалі беларускія маладзёжныя таварыствы, якія польская ўлада ігнаравала і прыцясняла. Было б добра ў будучым аўтару звярнуць на гэта ўвагу, як і на такія суполкі гэтага часу ў Празе.

Найбольшую ўвагу у даследаванні В. В. Даніловіч справядліва надае камуністычнаму саюзу моладзі Беларусі, найбольш масавай і ўплывовай арганізацыі, якая актыўна падтрымлівалася партыяй бальшавікоў, органамі ўлады. Гэта было важна для яе аўтарытэту, аднак не ў меншай меры прыцягальнай для маладых людзей была і арганізацыйная пабудова камсамола, яго мэты і задачы, рэальныя справы. Станоўча, што аўтар разглядае працэс станаўлення і развіцця ЛКСМБ не аднабакова, адналінейна, як гэта, як правіла, паказвалася ў савецкі час, але і не ачарняючы яго, а аб'ектыўна, з сучаснага навуковага пункту гледжання. Такі падыход заслугоўвае ўвагі і падтрымкі.

Дзякуючы падтрымцы РКП(б)–ВКП(б), камсамол стаў адзінай, самай масавай і ўплывовай маладзёжнай арганізацыяй, дзеючай на прынцыпах дэмакратычнага цэнтралізму і аб'ядноўваючай напрыканцы 1930-х гг. каля 370 тыс. сваіх членаў. Ён разглядаўся партыяй у якасці аднаго з трох «прывадных пасаў», які рабіў неабходнае палітычнае і ідэйнае ўздзеянне на светапогляд моладзі, дазваляў кантраляваць і накіроўваць яе актыўнасць для пабудовы сацыялізму. У той жа час большасць камсамольцаў і несаюзнай моладзі, па заключэнню аўтара, падтрымлівалі палітыку партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва (с. 237).

На аснове дакументальнага матэрыялу аўтар пераканаўча паказвае актыўны ўдзел моладзі ў духоўна-культурных пераўтварэннях беларускага грамадства, асабліва ў ліквідацыі непісьменнасці, станаўленні і развіцці сістэмы адукацыі, адраджэнні нацыянальна-культурнага жыцця і ўкараненні інтэрнацыяналізму, культурнай працы ў асяродку маладых людзей, антырэлігійнай дзейнасці. В. В. Даніловіч, у прыватнасці, правамерна адзначае, што менавіта ў ЛКСМБ раскрыўся талент такіх вядомых дзеячаў культуры, як кампазітар І. Лобан, мастак Я. Зайцаў, пісьменнікі Э. Агняцвет, П. Галавач, А. Куляшоў, П. Панчанка (с. 426).

Значны аб'ём працы прысвечаны дзейнасці маладых людзей па стварэнню эканамічнага фундамента рэспублікі праз актыўны ўдзел юнакоў і дзяўчат у мадэрнізацыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, а таксама ролі ЛКСМБ, несаюзнай моладзі ў вырашэнні іх бягучых сацыяльна-эканамічных праблем. Можна пагадзіцца з аўтарам, што менавіта ў разглядаемы перыяд была падрыхтавана маладая генерацыя кваліфікаваных працоўных у розных сферах народнай гаспадаркі, найперш ІТР, якая заклала добры падмурак для будучага паспяховага развіцця рэспублікі (с. 632).

Прытрымліваючыся комплекснага падыходу, В. В. Даніловіч не абмінуў тэму, якая была асабліва актуальная для таго перыяду, – удзел моладзі ў разгортванні фізкультурна-спартыўнай і ваенна-патрыятычнай работы. Дзяржава, якая ўпершыню будавала новае грамадства, знаходзілася ў капіталістычным акружэнні, магла выжыць найперш толькі дзякуючы згуртаванасці розных слаёў грамадства, высокай ступені індустрыялізацыі і абароназдольнасці. Гэта разумела не толькі кіраўніцтва СССР, але і моладзь, якая стала актыўна прымаць удзел у развіцці фізкультурна-масавага, спартыўнага руху, ваенна-шэфскай і ваенна-патрыятычнай працы. Па падліках аўтара, пры непасрэдным удзеле камсамольскіх арганізацый рэспублікі пачатковую ваенную падрыхтоўку атрымалі каля 380 тыс. дапрызыўнікоў; у Асаавіяхім былі ўцягнуты прыкладна 247 тыс. маладых людзей, нормы комплексаў "Варашылаўскага стралка" здалі каля 109 тыс. юнакоў і дзяўчат, "Гатоў да працы і абароны" – прыкладна 137 тыс., "Гатоў да супрацьпаветранай і проціхімічнай

абароны” – каля 125 тыс., “Гатоў да санітарнай абароны” – прыкладна 31 тыс. чалавек (с. 719). Такая дзейнасць, безумоўна, садзейнічала ўмацаванню абароназдольнасці Радзімы.

Такім чынам, неабходна адзначыць, што гістарычная навука Беларусі ўпершыню атрымала фундаментальную, комплексную навуковую працу. Яе комплекснасць заключаецца ў тым, што ў адной манаграфіі разглядаюцца: па-першае, розныя грамадска-палітычныя, сацыяльныя, нацыянальныя пласты моладзі, а не толькі камсамола; па-другое, актыўны ўдзел камсамола і несаюзнай моладзі ў вырашэнні задач у такіх сферах жыццядзейнасці, як грамадска-палітычная, духоўна-культурная, індустрыяльна-эканамічная, фізкультурна-спартыўная і ваенна-патрыятычная; па-трэцяе, працэсы ў маладзёжным асяродку разглядаюцца аўтарам не ізалявана, а ў цеснай сувязі з тымі працэсамі, якія адбываліся ў СССР і БССР у разглядаемы перыяд.

Аўтар на аснове дакументальнага матэрыялу навукова аналізуе розныя слаі моладзі і іх дзейнасць, не засяроджваецца толькі на пазітыўных аспектах, але адлюстроўвае і негатыўныя моманты, паказваючы іх прыроду.

Станоўчым з’яўляецца тое, што ў манаграфіі прадстаўлены фотаматэрыялы (копіі дакументаў, здымкі моладзі), маюцца шматлікія спасылкі на крыніцы, якія падмацоўваюць высновы аўтара.

Хочацца шчыра парадавацца за працу В. В. Даніловіча, за комплекснае, панарамнае даследаванне тэмы ў адзін са складанейшых перыядаў савецкай гісторыі, калі дзякуючы энергіі, энтузіязму, напорыстасці моладзі, пры ўсіх яе недахопах, былі закладзены асновы магутнасці як дзяржавы ў цэлым, так і рэспублікі ў прыватнасці, якія ў пасляваенны перыяд вывелі Беларусь з аграрнай у высокаіндустрыяльную рэспубліку.

Зразумела, што аўтарам сабраны багацейшы факталагічны матэрыял і даследчыку яго хочацца выкласці, падзяліцца ім з чытачом. Аднак мы жывём у час развітых інфармацыйных тэхналогій і мала хто, напэўна апрача даследчыкаў па тэме, паспрабуе асіліць 730 старонак тэксту (практычна 60 улікова-выдавецкіх аркушаў). Кніга ж фундаментальная, карысная найперш для моладзі, выкладчыкаў навучальных устаноў. Таму суб’ектыўнае пажаданне аўтару: па магчымасці істотна скараціць аб’ём манаграфіі для зручнасці масавага чытача.


## Информация об авторе

**Сороковик Иван Александрович** – кандидат исторических наук, доцент кафедры социально-гуманитарных дисциплин. Академия управления при Президенте Республики Беларусь (ул. Московская, 17, 220007, Минск, Республика Беларусь). E-mail: i.sorokovik@yandex.by

## Information about the author

**Ivan A. Sorokovik** – Ph. D. (Hist.), Associate Professor of the Department of Social and Humanitarian Disciplines. Academy of Management under the President of the Republic of Belarus (17 Moskovskaya Str., 220007Minsk, Belarus). E-mail: i.sorokovik@yandex.by